85.373(4Бел)
Ш 264

Д 114

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

УДК 791.43.03(476)(043.3)
ББК [85.373(4Беи)+85.370.4+85.374.042]я031
Ш 264

**Шаройка**
**Алена Мікалаеўна**

# ЖАНРАВА-СТЫЛЯВАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ГІСТАРЫЧНАГА ФІЛЬМА

Аўтарэферат дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата мастацтвазнаўства

па спецыяльнасці 17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтва

Репозиторий БГУКИ

Мінск 2011

Работа выканана на кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Навуковы кіраўнік: **Нячай Вольга Фёдараўна,**
доктар мастацтвазнаўства, прафесар

Афіцыйныя апаненты: **Сабалеўскі Анатоль Вікенцьевіч,**
доктар мастацтвазнаўства, прафесар, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела тэатральнага мастацтва ДНУ «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

**Сцяжко Наталля Рыгораўна,**
кандыдат мастацтвазнаўства, галоўны рэдактар РУП «Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм"»

Апаніруючая арганізацыя: УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»

Абарона адбудзецца 7 красавіка 2011 г. а 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі; e-mail: buk@buk.by; тэл. вучонага сакратара 222-83-79.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы 28 лютага 2011 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт В.У. Мазанік

Репозиторий БГУКИ

## КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Самапазнанне нацыі базіруецца на фундаменце гістарычнага вопыту. Экранная культура не абыходзіцца без роздумаў аб гістарычным быцці народа, выяўляючы і фарміруючы сваімі сродкамі гэтае самапазнанне.

Беларускі гістарычны фільм – неад'емны элемент айчыннай кінавытворчасці. Тэхнагеннасць і сінтэтычнасць кінавобраза, даступнасць і зразумеласць аўдыявізуальнай інфармацыі робяць гістарычны фільм магутным сродкам ідэалагічнага выхавання грамадзяніна. Спецыфіка прэзентацыі гістарычных падзей залежыць ад стратэгічных задач, якія стаяць перад дзяржавай у пэўную эпоху. Так, у беларускім гістарычным фільме перыяду ўваходжання нашай рэспублікі ў склад СССР (1919–1991) прыярытэт аддаваўся ўзнаўленню на экране падзей савецкай гісторыі – пераважна Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і Вялікай Айчыннай вайны. Гэта выявілася ў актыўным развіцці гісторыка-рэвалюцыйнага і ваенна-патрыятычнага фільма.

Пасля абвяшчэння ў 1991 г. незалежнасці Рэспублікі Беларусь, у сувязі са зменай эканамічнай, палітычнай і культурнай сітуацыі, у гістарычным фільме пачалі развівацца новыя тэматычныя кірункі. Неабходнасць дэманстрацыі ўнікальнасці і самабытнасці гістарычнага шляху беларускага народа прывяла да павелічэння ў 1990–2000-х гг. аб'ёмаў вытворчасці фільмаў, звернутых да дарэвалюцыйнай гісторыі.

На сённяшні дзень у айчынным кіназнаўстве глыбока і рознабакова даследаваны праблемы жанраўтварэння і стылявога вырашэння гісторыка-рэвалюцыйных і, асабліва, ваенна-патрыятычных фільмаў. Гістарычныя ж фільмы, у якіх у вобразна-экраннай форме адлюстраваны значныя падзеі мінуўшчыны Беларусі ад старажытнасці да 1917 г., пакуль не станавіліся аб'ектам сістэмна-абагульняльнага канцэптуальнага даследавання, скіраванага на аналіз іх жанрава-стылявой разнастайнасці. Адсутнасцю такіх работ у айчынным кіназнаўстве, а таксама неабходнасцю распрацоўкі метадалагічнай базы жанравага аналізу гістарычнага фільма абумоўлена актуальнасць дадзенага дысертацыйнага даследавання.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі

Тэма дысертацыі адпавядае даследаванням кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»: «Мастацкая культура Беларусі: XX ст.» (зацверджана на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 20.02.2001 г., пратакол № 6); «Кампаратывізм у сучасным мастацтвазнаўстве як навуковы падыход і творчы метад» (зацверджана на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 16.02.2006 г., пратакол № 12). Беларуская рэспубліканская

фонда фундаментальных даследаванняў «Кінематограф Беларусі – віртуальная фальклорна-этнаграфічная энцыклапедыя» на 2010–2012 гг. (зацверджана на пасяджэнні Навуковага савета Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў 29.04.2010 г., пратакол № 1, дагавор № Г10М-052).

Дадзеная навуковая работа адпавядае тэматыцы развіцця прыярытэтнага кірунку дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры (выхаванне грамадзяніна-патрыёта) рэспубліканскай праграмы «Моладзь Беларусі» на 2006–2010 гг. (зацверджана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 04.04.2006 г., указ № 200).

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта** даследавання – раскрыццё дынамікі і характару жанрава-стылявой эвалюцыі беларускага гістарычнага фільма.

Гэтай мэце падпарадкаваны наступныя **задачы** даследавання:

- вызначыць атрыбутыўныя прыкметы гістарычнага фільма;
- вылучыць і ахарактарызаваць этапы развіцця беларускага гістарычнага фільма;
- выявіць жанравыя разнавіднасці беларускага гістарычнага ігравога фільма;
- раскрыць адметныя рэжысёрска-стылявыя вырашэнні ў беларускім гістарычным дакументальным фільме.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца беларускі гістарычны фільм, сюжэт якога базіруецца на адлюстраванні падзей мінулага ад старажытнасці да XIX ст. уключна. **Прадмет даследавання** – жанры беларускага ігравога і дакументальнага гістарычнага фільма.

Выбар аб'екта і прадмета даследавання тлумачыцца вялікай каштоўнасцю гістарычнага фільма для беларускай культуры, а таксама неабходнасцю яго комплекснага вывучэння ў айчынным мастацтвазнаўстве.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Атрыбутыўнымі прыкметамі гістарычнага фільма з'яўляюцца карэлятыўныя паняцці: *«гістарычная падзея»* (факт мінулага, на які абапіраецца сюжэт кінастужкі), *«гістарычны персанаж»* (герой фільма, вобраз якога заснаваны на гістарычным прататыпе), *«гістарычны час»* (хранаграфія падзей стужкі), *«гістарычная прастора»* (тапаграфія падзей фільма). У сукупнасці гэтыя прыкметы абумоўліваюць мастацкую спецыфіку і змястоўнасць жанрава-стылявых экранных структур.

2. Эвалюцыйныя працэсы ў развіцці беларускага гістарычнага фільма адбываліся паэтапна, у адпаведнасці са зменай сацыякультурнага кантэксту і адпаведнай трансфармацыяй поглядаў на кінамастацтва ў цэлым. Першы этап (1925–1980-я гг.) характарызуецца дамінаваннем «чыстых жанраў» (меладрама, героіка-прыгодніцкі фільм). другі этап (1990–2006 гг.) – інтэнсіфікацыяй працэсу жанрава-стылявога, а таксама міжвідавога (ігравое і дакументальнае кіно: відэа і камп'ютарная графіка) сінтэзу.



3. Беларускі ігравы гістарычны фільм на першым этапе мае кананічную жанравую форму і прадстаўлены меладрамай, трагіфарсам, героіка-прыгодніцкім фільмам. Аўтары стужак на гэтым этапе канцэнтравалі ўвагу не на вобразным узнаўленні эпохі, а на яе фармальнай рэпрэзентацыі (касцюмы, інтэр'ер). На другім этапе актывізаваўся міжжанравы сінтэз «чыстых жанраў» (меладрама, героіка-прыгодніцкі фільм) з псіхалагічнай драмай і эпапеяй. Паэтыка фільмаў ускладнілася за кошт пашырэння мастацкага аб'ёму прасторава-часавага кантынууму.

4. Як самастойная мастацкая з'ява беларускі дакументальны гістарычны фільм актыўна развіваецца на другім этапе (1990–2006). Рэжысёрскія пошукі былі скіраваны на распрацоўку варыятыўных форм традыцыйнага для кінадакументалістыкі жанру фільма-партрэта. Гэта прывяло да з'яўлення такіх жанравых мадыфікацый, як фільм-расследаванне, фільм-павучэнне, «паэтычная біяграфія», якія дазволілі аўтарам паказаць супярэчлівы лёс гістарычнай асобы, аднавіць кінематаграфічнымі сродкамі яе адметны жыццёвы шлях. Тэлебачанне, лічбавыя тэхналогіі стымулявалі міжвідавы сінтэз ігравога і дакументальнага кіно, што абумовіла з'яўленне дакументальна-мастацкага тэлефільма-«хронікі».

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Поўны аб'ём дысертацыі выкананы аўтарам самастойна. Упершыню ў айчынным мастацтвазнаўстве беларускі гістарычны фільм стаў аб'ектам гісторыка-тэарэтычнага даследавання. Асабісты ўклад саіскальніка заключаецца ў распрацоўцы метадычнага падыходу да аналізу гістарычнага фільма праз вызначэнне яго атрыбутыўных прыкмет і вылучэнне жанрава-стылявых разнавіднасцей як у ігравым, так і дакументальным відах кінамастацтва. Выяўленне этапаў эвалюцыі беларускага гістарычнага фільма дазваляе прасачыць развіццё і ўзбагачэнне яго жанрава-стылявых структур – ад простых мастацкіх пабудоў да складаных жанравых мадыфікацый, заснаваных на сінтэзе традыцыйных магчымасцей кінамастацтва з эстэтыкай тэлебачання, відэакультуры, дыгітальнага мастацтва.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі прадстаўлены ў выглядзе дакладаў на 14 міжнародных, 2 рэспубліканскіх, 3 універсітэцкіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: XXIX выніковай навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ культуры (Мінск, 22–23 красавіка 2004 г.); XXX і XXXI выніковых навуковых канферэнцыях студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (Мінск, 20–21 красавіка 2005 г.; Мінск, 21 красавіка 2006 г.); Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Сучаснае беларускае мастацтва і нацыянальная мастацкая школа: праблемы захавання самабытнасці і далейшага развіцця» (Мінск, 14–15 лістапада 2005 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Праблемы тэатральнага, музычнага і кінатэлемастацтва ў кантэксце славянскіх культур у сучасным свеце» (Мінск, 1 снежня 2005 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі



Репозиторий БГУКИ

«Актуальныя праблемы сучаснай культуры» (Мінск, 18 кастрычніка 2006 г.); Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Актуальныя праблемы мастацтва і сучаснай мастацкай школы Беларусі ва ўмовах глабалізацыі культуры» (Мінск, 19 кастрычніка 2006 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 200-годдзю Н. Орды, «Напалеон Орда: жыццё, творчасць, мастацкая спадчына» (Мінск, 15–16 лютага 2007 г.); Міжнароднай навукова-творчай канферэнцыі «Чалавек. Навука. Творчасць» (Мінск, 19–20 красавіка 2007 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Праблемы вывучэння культурных сувязяў на этнакантактных тэрыторыях у славянскім свеце» (Мінск, 22–24 мая 2007 г.); XIII і XIV Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24–26 мая 2007 г.; Мінск 22–24 мая 2008 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Актуальныя праблемы фізічнай і сацыякультурнай антрапалогіі» (Мінск, 19–21 чэрвеня 2007 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Сучасная экранная культура: тэндэнцыі развіцця і аптымізацыя кіравання» (Мінск, 19–20 снежня 2008 г.); Міжнароднай навукова-творчай канферэнцыі «III Няфёдаўскія чытанні. Беларускае мастацтва: традыцыі і сучаснасць» (Мінск, 19 сакавіка 2009 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыі і сучаснае становішча культуры і мастацтваў» (Мінск, 24–25 верасня 2009 г.); VIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Этнасацыяльныя і канфесіянальныя працэсы ў сучасным грамадстве» (Гродна, 10–11 снежня 2009 г.); IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Культура. Навука. Творчасць» (Мінск, 22–23 красавіка 2010 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Роля традыцый народнай культуры ў адраджэнні беларускага сяла» (Іванава, 24 верасня 2010 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Нацыянальная культура і мастацтва Беларусі ў еўрапейскім кантэксце» (Мінск, 18–19 лістапада 2010 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 15 публікацыях: 3 – у навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК (1,8 аўтарскага аркуша), 5 – у навуковых зборніках, рэкамендаваных ВАК (1,5 аўтарскага аркуша), 7 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый (1,6 аўтарскага аркуша). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 4,9 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў, шасці падраздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, трох дадаткаў.

Поўны аб'ём навуковай работы – 188 старонак. Асноўны тэкст дысертацыі выкладзены на 104 старонках. Бібліяграфічны спіс займае 19 старонак і складаецца са спіса выкарыстаных крыніц (250 найменняў на рускай, беларускай, англійскай, польскай, італьянскай мовах) і спіса публікацый аўтара (15 крыніц на рускай і беларускай мовах). Дадаткі займаюць 65 старонак.



Логіка пабудовы дысертацыі абумоўлена агульнай канцэпцыяй даследавання, у адпаведнасці з якой беларускі гістарычны фільм разглядаецца з пазіцый жанравай дыверсіфікацыі ў кантэксце эвалюцыі айчыннага ігравога і дакументальнага кіно.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваецца выбар тэмы работы, яе актуальнасць, вылучаецца кола пытанняў па дадзенай праблематыцы, якое патрабуе спецыяльнага вывучэння, акрэсліваецца навуковае поле ў кантэксце сучасных даследаванняў у галіне кіназнаўства.

У **агульнай характарыстыцы работы** вызначаюцца сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі, мэта, задачы, аб'ект і прадмет даследавання, фармулююцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, выяўляецца асабісты ўклад саіскальніка, прыводзяцца звесткі аб апрабацыі і апублікаванасці вынікаў дысертацыйнага даследавання, структуры і аб'ёме работы.

Першы раздзел **«Гістарычны фільм: тэарэтычны аспект даследавання»** падзяляецца на два падраздзелы. У падраздзеле 1.1 **«Аналітычны агляд літаратуры і метадалогія даследавання»** разглядаюцца навуковыя публікацыі і метадалагічныя напрацоўкі сусветнай і беларускай навукі ў сферы вывучэння гістарычнага фільма.

Тэарэтычнае асэнсаванне гістарычнага фільма ў савецкім кіназнаўстве пачалося ў 1940-я гг. (С. Эйзенштэйн, Р. Юрэнеў). Пазней у залежнасці ад мэты даследавання розныя вучоныя звярталі ўвагу на спецыфіку гістарычнага фільма ў межах вывучэння гісторыка-біяграфічнага (Р. Юрэнеў, М. Андронікава), гісторыка-рэвалюцыйнага (М. Блейман, Н. Зоркая, А. Караганаў, Р. Юрэнеў), ваенна-патрыятычнага фільма (М. Зак, А. Красінскі, К. Огнеў, В. Смаль). Значны ўклад у даследаванне гістарычнага фільма быў зроблены сучаснымі расійскімі навукоўцамі В. Кляймёнавай, К. Огневым, Ю. Цюрыным (ігравое кіно), В. Іарданідзі, В. Ліставым (неігравое кіно).

Істотнае значэнне для распрацоўкі тэмы даследавання мелі манаграфіі замежных аўтараў: Г. Горы «Гісторыя кіно: рэканструкцыя мінулага, інтэрпрэтацыя сучаснага» (G. Gori, «La storia al cinema: ricostruzione del passato, interpretazione del presente»), Е. Плажэўскага «Гісторыя кіно» (J. Płażewski, «Historia filmu: 1895–2005»), Д. Саламона «Антычны свет у кіно» (J. Solomon, «The Ancient World in the Cinema»), Д. Элдрыджа «Гісторыя галівудскіх фільмаў» (G. Eldridge, «Hollywood's History Films»), Д. Элі «Эпічны фільм: міф і гісторыя» (D. Elley, «The epic film: myth and history»), С. Яніцкага «Польскія мастацкія фільмы 1902–1988» (S. Janicki, «Polskie filmy fabularne 1902–1988»), у якіх змешчаны каштоўныя назіранні за працэсамі, якія адбываліся на працягу XX ст. у сусветным кінематографе ў цэлым, і ў гістарычным фільме ў прыватнасці.

На сённяшні дзень у айчынным кіназнаўстве адсутнічаюць спецыяльныя комплексныя працы аб беларускім гістарычным фільме. Разнастайныя аспекты



Репозиторий БГУКИ

гістарычнай праблематыкі ў беларускім кіно, асаблівасці яе рэпрэзентацыі ў экранных творах айчынных кінематаграфістаў у той ці іншай ступені разглядаліся ў шэрагу публікацый Л. Зайцавай, А. Карпілавай, А. Красінскага, В. Мядзведзевай, В. Нячай, К. Рэмішэўскага, Л. Саянковай, І. Смірновай, Н. Сцяжко, Н. Фральцовай, Г. Шур. Аднак пры значнай колькасці работ, прысвечаных беларускаму гістарычнаму фільму, усебаковы аналіз яго жанрава-стылявой эвалюцыі не ажыццяўляўся. Вырашэнню гэтых праблем і прысвечана дадзеная дысертацыя.

У дадзенай навуковай працы быў улічаны таксама і вопыт даследавання гістарычнага жанру беларускімі і замежнымі спецыялістамі ў галіне *фалькларыстыкі* (І. Гурскі, К. Кабашнікаў), *літаратуразнаўства* (І. Дамарад, М. Бахцін, Д. Ліхачоў, А. Лойка, А. Макарэвіч, А. Мальдзіс, Л. Прашковіч, В. Чамярыцкі, В. Шынкарэнка), *мастацтвазнаўства* (Н. Высоцкая, В. Дадзіёмава, Л. Дробаў, Т. Гаробчанка, Л. Касцюкавец, Л. Тананаева, Р. Смольскі, А. Сабалеўскі, А. Хадыка).

Для поўнага і ўсебаковага разгляду заяўленай тэмы ўлічваліся мастацтвазнаўчыя працы па тэорыі жанраўтварэння. Праблема жанру і звязаныя з яе даследаваннем пытанні жанравага канона, залежнасці жанру і стылю ад аўтарскай «карціны свету» прыцягвалі да сябе ўвагу такіх расійскіх і беларускіх даследчыкаў, як В. Багдасаран, Л. Зайцава, А. Караганаў, Л. Нехарошаў, В. Нячай, А. Плахаў, Г. Ратнікаў, І. Рубанава, Р. Юрэнеў, С. Фрэйліх, А. Ярохін.

Мэта і задачы даследавання, яго матэрыялы і агульная накіраванасць вызначылі неабходнасць выкарыстання навуковага прынцыпу гістарызму. Ён дазваляе выявіць і асэнсаваць масіў разнастайных крыніц, стварыць на іх падставе гістарычна дакладную карціну развіцця экраннага мастацтва XX – пачатку XXI ст., даць аб'ектыўную ацэнку жанрава-стылявой эвалюцыі беларускага гістарычнага фільма.

У аснову **метадалогіі даследавання** ў дадзенай дысертацыйнай працы была пакладзена тэорыя кіножанраў прафесара В. Нячай, на падставе якой вызначаны мэта, задачы, структура дысертацыі. Дадатковай метадалагічнай апорай сталі даследаванні ў галіне жанравай прыроды кіно расійскіх кіназнаўцаў С. Драбашэнкі, А. Карцавай, Я. Маркулан, С. Фрэйліха.

Работа заснавана на комплексным і сістэмным падыходах да пастаўленай праблемы. Комплексны падыход дазваляе разгледзець аб'ект даследавання як суцэльную з'яву, якая развіваецца на глебе мастацкай культуры і мае генетычныя сувязі з фальклорам і традыцыйнымі відамі мастацтваў. Сістэмны падыход найбольш эфектыўны пры вывучэнні заканамернасцей развіцця ўсіх відаў экраннага мастацтва з улікам іх узаемаўплываў.

У якасці асноўных метадаў выкарыстоўваліся: кампаратыўны, гісторыка-параўнальны, мастацтвазнаўчы аналіз. Кампаратыўны метад дазволіў пашырыць магчымасці мастацтвазнаўчага аналізу, вылучыць адметныя характарыстыкі жанраў беларускага гістарычнага фільма, узбагаціла арсенал сродкаў асэнсавання мастацкага тэксту. Гісторыка-параўнальны метад даў магчымасць раскрыць спецыфічныя



асаблівасці дынамікі беларускага гістарычнага фільма, правесці паралелі з аналагічнымі працэсамі ў замежным кіно. Мастацтвазнаўчы аналіз паспрыяў выяўленню рэжысёрска-стылявых вырашэнняў у беларускіх ігравых і дакументальных гістарычных фільмах.

У падраздзеле 1.2 **«Атрыбутыўныя прыкметы гістарычнага фільма»** тэарэтычна абгрунтоўваюцца змястоўныя характарыстыкі гістарычнага фільма з пункту гледжання класічнай тэорыі мастацтваў.

З'явіўшыся напрыканцы XIX ст. (1895), кінамастацтва дало гістарычнай мінуўшчыне новую, экранную форму выяўлення. У параўнанні з фальклорам і традыцыйнымі відамі мастацтваў яно адкрыла магчымасць захавання ўяўленняў пра гістарычныя падзеі і гістарычных асоб у гука-зрокавых версіях, дазволіла «ажывіць» мінулае.

Аўтары гістарычнага фільма пастаянна вырашаюць найскладанейшую і найактуальнейшую праблему – праблему суадносін факталагічнай дакладнасці і мастацкай выдумкі. Яе вырашэнне залежыць ад уласных адносін аўтараў да гісторыі і ад задачы, якую яны ставяць перад сабой, – быць «аб'ектыўнымі» ці «суб'ектыўнымі». Кіно не стварае «альтэрнатыўнай гісторыі», але і не з'яўляецца яе «мастацкай аналогіяй». Падзеі мінулага шматразова пераасэнсоўваюцца, паглыблена даследуюцца, успрымаюцца дыялектычна ў новых гістарычных сувязях, колькасць іх трактовак расце, структура пастаянна змяняецца.

У адпаведнасці са зместам гістарычнага фільма вылучаюцца чатыры яго змястоўныя характарыстыкі: гістарычная падзея, гістарычны персанаж, гістарычны час і гістарычная прастора. Яны па-рознаму ўплываюць на сюжэтапабудову жанраў гістарычнага фільма і набываюць розную афарбоўку.

Гістарычная падзея ў фільме разумеецца як рэальны факт канкрэтнай эпохі, які адлюстроўваецца ў кінатворы. Гістарычны персанаж – гэта герой стужкі, які можа мець прататып (асобу, што рэальна існавала) ці ўвасабляць рысы чалавека пэўнай эпохі; падзеі яго жыцця з'яўляюцца асновай фабулы. Гістарычны час разумеецца як рэальны час дакладнага перыяду, паказанага ў фільме (эпоха, стагоддзе, дзесяцігоддзі і г. д.). Гістарычная прастора характарызуе месца дзеяння, якое, як правіла, у гістарычным фільме геаграфічна вызначана. Вылучаныя прыкметы з'яўляюцца карэлятыўнымі паняццямі і ў сукупнасці дазваляюць атрыбуціраваць фільм як гістарычны.

Неад'емнай уласцівасцю гістарычнага фільма з'яўляецца адпаведнасць фактам і дакументам. Аднак прынцыпы работы з імі адрозніваюцца ў залежнасці ад віду кінамастацтва. Аўтары ігравога фільма больш «свабодныя» ў сваёй трактоўцы гістарычнага матэрыялу ў параўнанні са стваральнікамі неігравых кінастужак. Аднак, нягледзячы на гэтую розніцу, важна падкрэсліць, што ні ігравы, ні дакументальны гістарычны фільм не прадстаўляюць «альтэрнатыўнай гісторыі» і не з'яўляюцца яе



Репозиторий БГУКИ

дакладным экранным адбіткам. У любым выпадку гістарычны фільм, як і кожны іншы, – *мастацкая інтэрпрэтацыя рэчаіснасці*, яе вобразнае асэнсаванне.

Кожная з груп жанраў гістарычнага фільма адрозніваецца па прасторава-часавай арганізацыі сюжэта. У драматычных жанрах гістарычныя прастора і час звязаны з падзеямі жыцця гістарычнага (рэальнага ці выдуманага) персанажа. Групе эпічных жанраў уласцівы шырокі ахоп гістарычных прасторы і часу: ад пэўнага моманту гісторыі (заваёва ўлады, каранацыя і г. д.) да працяглага працэсу (вайна). Падзеі ў эпічных жанрах адбываюцца на авансцэне гісторыі, а гістарычныя героі дзейнічаюць у пераломныя моманты эпохі. У ліра-эпічных жанрах прастора і час вольныя, мазаічна раз'яднаныя на асобныя фрагменты і асацыятыўна злучаныя ў свядомасці лірычнага героя. Тут аўтар – дэміург прасторы і часу, ён выхоплівае з эпахальнай плыні найбольш значныя для яго падзеі і вольна супастаўляе з іншымі.

Абіраючы пэўны жанр, аўтары гістарычнага фільма выкарыстоўваюць яго спецыфічныя каноны (коды), якія становяцца сродкам камунікацыі паміж аўтарам (рэжысёрам) і адрасатам (гледачом). Кінажанр – гэта сістэма параметраў экраннага пераказу, якая вызначае характар дадзенага фільма і акрэслівае яго агульную формулу. Параметры падзяляюцца на канвенцыйныя (традыцыйныя, паўтаральныя, кананічныя элементы ці жанравыя клішэ) і інвенцыйныя (змяняльныя, наватарскія элементы) і адпаведна складаюць генатып і фенатып жанру. Канвенцыйныя элементы складаюць так званы канон жанру – устойлівы механізм, які забяспечвае яму стабільнасць. Інвенцыйныя элементы прыўносяцца аўтарам. Іх наяўнасць дазваляе меркаваць аб характары індывідуальнага аўтарскага стылю. Сукупнасць жанравых параметраў адыгрывае важную ролю ў камунікацыі з гледачом, рэгулюе ступень зразумеласці і арыгінальнасці фільма.

Эвалюцыйным зменам падуладны не толькі асобныя формулы жанру, але і ён сам. Жанр – гэта не толькі паўтаральны, але і зменны элемент кінамовы. Адны жанры ўваходзяць ва ўжытак і становяцца больш папулярнымі і прывабнымі (дастаткова ўзгадаць, напрыклад, што кінаэкспрэсіяністы аддавалі перавагу фільму жахаў – жанравай разнавіднасці прыгодніцкага фільма), іншыя – страчваюць сэнс і адыгрываюць усё меншую ролю (на сённяшні дзень адышоў у нябыт жанр вестэрна).

Эвалюцыйная логіка гістарычнага фільма ў айчынным кінамастацтве абумоўлена зменай палітычных і сацыякультурных працэсаў у Беларусі. Зыходзячы з гэтага, мы вылучаем два этапы развіцця беларускага гістарычнага кіно: 1925–1980-я гг. (ад першых хранікальных рэпартажаў да кінастужак перабудовачнага часу ўключна) – савецкі перыяд; 1990–2006 гг. (ад нарматыўных жанраў да ўскладненых жанрава-стылявых мадыфікацый) – постсавецкі перыяд.

У другім раздзеле **«Беларускі іграві гістарычны фільм: традыцыйныя жанры і іх сінтэз»** разглядаюцца этапы развіцця айчыннага ігравога гістарычнага фільма, вызначаюцца і аналізуюцца найбольш пашыраныя яго жанравыя разнавіднасці.



У падраздзеле 2.1 **«<u>Увасабленне канонаў «чыстых жанраў» у гістарычных фільмах 1925–1980-х гг.</u>»** даследуюцца беларускія гістарычныя стужкі, створаныя ў жанры меладрамы, героіка-прыгодніцкага фільма.

Першапачаткова беларускі гістарычны фільм развіваўся пад моцным уплывам гісторыка-рэвалюцыйнага фільма. За перыяд 1925 – канец 1980-х гг. у Беларусі фактычна было знята толькі чатыры фільмы, у якіх аўтары звярнуліся да падзей дарэвалюцыйнай эпохі: «Кастусь Каліноўскі» (1927, У. Гардзін), «Паручнік Кіжэ» (1933, А. Файнцымер), «Я, Францыск Скарына...» (1969, Б. Сцяпанаў), «Магіла льва» (1971, В. Рубінчык).

Стужкі канца 1920-х – пачатку 1930-х гг. былі зняты ў так званых масавых кінажанрах, разлічаных на глядацкі поспех (гістарычны героіка-прыгодніцкі фільм «Кастусь Каліноўскі» (1927) і гістарычны фарс «Паручнік Кіжэ» (1933)). Героі гэтых фільмаў – рэвалюцыянер-дэмакрат, кіраўнік паўстання 1863 г. на тэрыторыі Польшчы, Літвы і Беларусі Кастусь Каліноўскі і расійскі імператар Павел I (перыяд царавання – 1796–1801) – рэальныя гістарычныя асобы, якія пакінулі свой адметны след у гісторыі. Аднак вышэйзгаданыя фільмы не давалі гледачу грунтоўнага ўяўлення аб іх жыцці і дзейнасці: Кастусь Каліноўскі паводзіў сябе на экране як герой-авантурыст, а Павел I з'яўляўся аб'ектам сатырычнага высмейвання. Плакатнасць, злабадзённасць, дагматызм і адпаведная таму часу ідэалагічная дактрына даваеннага айчыннага кіно, асабліва ў 1930-я гг., выключалі і рабілі немагчымым праўдзівы паказ на экране рэальных гістарычных дзеячаў.

Асноўным тэматычным кірункам кінавытворчасці 1950–1980-х гг. быў ваенна-патрыятычны. Гістарычны героіка-прыгодніцкі фільм пра беларускага першадрукара «Я, Францыск Скарына...» (1969, Б. Сцяпанаў) і гістарычная меладрама з элементамі кіналегенды пра волата Машэку «Магіла льва» (1971, В. Рубінчык) – адзінкавыя прыклады звароту беларускіх кінематаграфістаў да распрацоўкі матэрыялу аддаленага мінулага. Гэтыя стужкі былі зняты ў адпаведных жанравых традыцыях з улікам глядацкай цікавасці да героіка-прыгодніцкага фільма і да меладрамы. Згодна з канонамі азначаных жанраў рэпрэзентаваліся пратаганісты фільмаў (Францыск Скарына, Машэка): яны паводзілі сябе як тыповыя героі-авантурысты і героі-каханкі.

Падкрэслім, што гістарычных стужак у айчыннай фільмаграфіі магло быць значна больш. Так, з архіўных крыніц вядома, што ў канцы 1920-х гг. студыяй «Белдзяржкіно» разглядалася магчымасць ажыццяўлення здымак гістарычнай кінадрамы «З-пад ярма» (другая назва – «Пярвуша Шэршань») пра масавыя ссылкі ў Сібір у XVII ст. беларускага насельніцтва, якое было не задаволена сваім сацыяльным становішчам. Працэс стварэння сцэнарыя адлюстраваны ў трох варыянтах літаратурнага тэксту, што дазваляе вылучыць асобныя этапы працы над ім. Архіўныя матэрыялы пацвярджаюць, што распрацоўка лібрэта «З-пад ярма» была распачата этнографам, пісьменнікам, тэатразнаўцам Я. Дылам, магчыма, на працягу другой паловы 1927 г. сумесна з мантажорам І. Маронам, для якога гэта было першай



Репозиторий БГУКИ

спробай пяра. У канцы таго ж года сцэнарый быў прададзены кінафабрыцы «Белдзяржкіно». Рэжысёрам фільма мог стаць Ю. Тарыч. Як вядома з яго ліста да Я. Дылы з рэцэнзіяй на кінасцэнарый «Пярвуша Шэршань», рэжысёр быў зацікаўлены прапанаваным матэрыялам і жадаў яго ўвасобіць на экране. Ю. Тарыч лічыў, што гэтая стужка магла б стаць «Звянігарой» Беларусі – значным эпічным кіналалатном, накшталт фільма А. Даўжэнкі 1928 г., дзе былі аб'яднаны гісторыя, казка і хроніка, эпас, лірыка і сатыра.

Сярод неажыццёўленых праектаў застаўся і праект фільма па сцэнарыі «Адам Міцкевіч» рэжысёра М. Бераснева, напісаным у 1936 г. У сцэнарыі знайшлі сваё адлюстраванне факты з біяграфіі паэта (перыяд яго жыцця з 1823 па 1829 гг.). На думку аўтара, яго матэрыял быў вельмі актуальны і злабадзённы: у фінале фільма меркавалася даць кадры кінахронікі, паказаць іспанскіх паўстанцаў, якія выступалі пад сцягамі з выявай А. Міцкевіча супраць Франка, сцвярджаючы такім чынам бессмяротнасць ідэй паэта і яго памкнення да свабоды чалавека, незалежнасці Радзімы. Для перадачы каларыту эпохі, а таксама для выяўлення нацыянальнай і саслоўнай прыналежнасці герояў М. Бераснеў насыціў іх рэплікі словамі з розных еўрапейскіх моў.

Праца над творчай рэалізацыяй літаратурнага сцэнарыя «Адам Міцкевіч» была спынена ў пачатку 1939 г. з прычыны абвастрэння зносін паміж СССР і Польшчай напярэдадні Другой сусветнай вайны.

У падраздзеле 2.2 **«Жанравы сінтэз у беларускіх ігравых гістарычных фільмах 1990–2006 гг.»** прасочана развіццё гістарычнага фільма на мяжы XX–XXI стст.

У перыяд 1990–2006 гг. беларускі гістарычны фільм развіваўся больш інтэнсіўна ў параўнанні з папярэднімі дзесяцігоддзямі. Глядацкая цікавасць да мінуўшчыны, у тым ліку да асабістага жыцця рэальных гістарычных асоб, прывяла да актуалізацыі гістарычнага фільма. Тым не менш гэта не паспрыяла маштабнаму павелічэнню вытворчасці беларускіх ігравых фільмаў на гістарычную тэматыку. Так, на «Беларусьфільме» былі створаны дзве кінастужкі – «Крыж міласэрнасці» пра беларускую паэтэсу А. Пашкевіч (Цётку) (1991, Д. Ніжнікоўская) і «Настасся Слуцкая» пра княгіню з роду Алелькавічаў (2003, Ю. Ялхоў). Рэжысёр У. Арлоў на базе «Белвідэацэнтра» і «Тэлефільма» ажыццявіў здымкі маштабнага шматсерыйнага тэлесерыяла «Пракляты ўтульны дом» (1998) пра паўстанне 1863 г. на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Польшчы пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага. На студыі «Сінемарэк» Д. Ніжнікоўская зняла шматсерыйную тэлевізійную стужку «Раман імператара (дварцовая хроніка)» (1994) пра лёс расійскага імператара Аляксандра II. На жаль, гэты тэлефільм, які выклікаў вялікую цікавасць беларускага і замежнага гледача, – адзіная шматсерыйная ігравая стужка, створаная на студыі «Сінемарэк». Сярод праектаў кампаніі, што да гэтага часу чакаюць сваёй рэалізацыі, – задуманы



рэжысёрам яшчэ ў канцы 1990-х гг. шматсерыйны тэлевізійны фільм «Раман імператара (загадкавае цараванне)», які б расказаў гледачу аб любоўных зносінах паміж імператарам Паўлам I і княгіняй Ганнай Лапухінай. Гэта мастацкая стужка па сутнасці працягнула б экранную распрацоўку тэмы прыватнага жыцця манаршых асоб, распачатую папярэднім фільмам рэжысёра.

Агульнай для аўтараў кінастужак 1990–2006 гг. была арыентацыя на масавую аўдыторыю. Таму традыцыйна запатрабаванай заставалася меладрама, якая па сваёй прыродзе найбольш прыдатная да сінтэтычнага ўзаемадзеяння з іншымі жанрамі кінематографа: з прыгодніцкім фільмам («Раман імператара», «Пракляты ўтульны дом»); з псіхалагічнай драмай («Крыж міласэрнасці»); з прыгодніцкім фільмам і кінаэпапеяй («Настасся Слуцкая»).

Агульным для фільмаў 1990–2006 гг. стала значнае пашырэнне храналагічнага ахопу гістарычных падзей. Кінематографісты звяртаюцца да раней нераспрацаваных пластоў мінулага. Аўтары надаюць большую ўвагу тым падзеям, якія, на іх погляд, забяспечваюць раскрыццё жанравай (пераважна меладраматычнай) спецыфікі фільма. У гістарычнай меладраме акцэнтуюцца факты асабістага жыцця гістарычнай асобы, а глабальныя гістарычныя падзеі выступаюць своеасаблівым фонам і трактуюцца як вызначальныя і нават фатальныя ў лёсе персанажа («Раман імператара», «Пракляты ўтульны дом»).

Адной з характэрных асаблівасцей гістарычных фільмаў, знятых на рубяжы XX–XXI стст., стала аднаўленне гістарычных падзей у іх рэальным топасе, што звязана з пашырэннем светаўспрымання гледача ва ўмовах глабалізацыі і адкрытасці культурных і інфармацыйных межаў. Рэальны топас гісторыі забяспечвае стварэнне своеасаблівага «калідора часу», праз які ажыццяўляецца сувязь мінулага і сучаснасці з арыентацыяй на трансляцыю ў будучыню. Натуральная гістарычная прастора падкрэслівае рэалістычнасць падзей, дапамагае ў раскрыцці вобраза гістарычнай асобы. Выкарыстанне гістарычнага рэквізіту, стылізацыя касцюма сталі абавязковымі ўласцівасцямі беларускага ігравога гістарычнага фільма.

У трэцім раздзеле **«Беларускі дакументальны гістарычны фільм: рэжысёрска-стылявыя вырашэнні»** на падставе аналізу прадукцыі дакументальнага кіно канца XX ст. прасочваецца працэс жанравай дыверсіфікацыі гістарычных экранных твораў, адзначаюцца асаблівасці творчых пошукаў беларускіх рэжысёраў.

Да сярэдзіны 1980-х гг. кінематографісты амаль не звяртаюцца да аддаленай гісторыі Беларусі. З пачаткам перабудовы сітуацыя радыкальна змяняецца, што прыводзіць у 1990-я гг. да сапраўднага выбуху гістарычнай дакументалістыкі і тэматычнага яе разнявольвання.

У падраздзеле 3.1 **«Жанравыя мадыфікацыі фільма-партрэта ў беларускім дакументальным гістарычным кіно 1990–2006 гг.»** выяўляецца спецыфіка развіцця фільма-партрэта ў азначаны перыяд. Характэрнымі рысамі гэтага жанра экраннай



Репозиторий БГУКИ

дакументалістыкі з'яўляюцца: выкарыстанне канонаў біяграфічнага фільма (апора фабулы на біяграфічныя звесткі), ілюстрацыйнасць і доказнасць (выкарыстанне фактaлагічнага матэрыялу). Традыцыйная мадэль фільма-партрэта рэалізуецца ў кінаработах рэжысёраў С. Гайдука, М. Князева, М. Жданоўскага, У. Кавалёва, В. Сукманава, Р. Ясінскага.

На хвалі грамадскіх і культурных пераўтварэнняў у 1990-я гг. з'яўляюцца тры жанравыя мадыфікацыі фільма-партрэта: фільм-павучэнне, фільм-расследаванне, «паэтычная біяграфія».

Першая з іх – *фільм-павучэнне* – звязана з раскрыццём хрысціянскай тэматыкі на беларускім экране. Па сваёй змястоўнай накіраванасці і кампазіцыйнай пабудове такога кшталту фільмы можна суаднесці з рэлігійна-дыдактычнымі жанрамі царкоўнай літаратуры, найперш такім як павучэнне. Гэтая жанравая мадыфікацыя плённа рэалізуецца ў творчасці такіх аўтараў, як В. Шавялевіч і В. Чацверыкоў.

У сваіх фільмах-павучэннях В. Шавялевіч узнаўляе не столькі рэальны жыццяпіс асобы, колькі яе «духоўную біяграфію». Тут у мастацкай форме пададзены разважанні маральна-этычнага зместу ад асобы знакамітага сучасніка, носьбіта высокай духоўнай культуры. Мы залічваем такога кшталту фільмы да гістарычных, паколькі героі гэтых стужак (напрыклад, у дылогіі В. Шавялевіча «Да вас, сучаснікі мае» (1989–1990) – акадэмік Д. Ліхачоў і мітрапаліт Мінскі, Слуцкі, Патрыяршы Экзарх Усяе Беларусі Уладыка Філарэт) у сваіх разважаннях пра духоўныя праблемы сучаснага грамадства прыводзяць прыклады з гісторыі, якія падмацоўваюцца ігравымі эпізодамі (інсцэніроўкамі адпаведных гістарычных падзей).

Да фільма-павучэння набліжаецца таксама і тэлевізійная дылогія В. Шавялевіча «Пісьмы пра добрае і прыгожае» (1998–1999), дзе ў маналагічнай форме расійскі акадэмік, літаратуразнаўца-медыявіст Д. Ліхачоў падзяліўся сваімі роздумамі і перасцярогамі ў дачыненні да сучаснасці і будучыні. На прыкладзе сітуацый з уласнага жыцця ён растлумачыў, наколькі неабходна чалавеку быць гуманным, развіваць і гарманізаваць свой духоўны свет.

Праблемы хрысціянскай маралі закранаюцца ў фільме-павучэнні «Разумовасць у фарбах» (рэжысёр В. Чацверыкоў, 1998). Паэтычная назва для дакументальнай стужкі была ўзята з аднайменнага артыкула аб іконе – шэдэўры рускай рэлігійнай думкі і праваслаўнага выяўленчага мастацтва – філосафа пачатку XX ст. князя Я. Трубяцкога. Рэжысёр паспрабаваў данесці да гледача філасофскія погляды Я. Трубяцкога, актуалізуючы багатую выяўленчую і музычную спадчыну, расказваючы пра мастацтва сродкамі самога ж мастацтва. У канчатковым выніку аўтар стварыў у фільме атмасферу сузірання, адкрытасці традыцыям праваслаўнага вучэння.

Па сваім змесце і дыдактычным пафасе да фільмаў-павучэнняў набліжаюцца таксама і стужкі «Кірыла Тураўскі» (рэжысёр С. Гайдук, 1990), «Зорка Афанасія»



(рэжысёр М. Князеў, 1997). У гэтых кінатворах, як прынята ў жыційнай літаратуры, пераказваецца жыццёвы шлях кананізаваных асоб (адпаведна Кірылы Тураўскага і Афанасія Брэсцкага). Пры гэтым экранныя агіёграфы (аўтары фільмаў) прадстаўляюць не ўвесь жыццяпіс сваіх герояў, а перадусім іх духоўную біяграфію, дзе першасным з'яўляецца жыццё рэлігійнае, сакральнае, а не чалавечае, прафаннае, складзенае з канкрэтных дат, падзей, імёнаў.

Жанравая мадыфікацыя *фільма-расследавання* спалучае рысы публіцыстычнага жанру журналісцкага расследавання і біяграфічнага фільма. У беларускім неігравым кіно яе ўпершыню прапанаваў А. Алай, зняўшы фільм «Фельдмаршал Гурка» (1998) пра генерал-фельдмаршала В. Гурку (Рамейку-Гурку), які паходзіў з Магілёўшчыны. Пошукі магчымага месца знаходжання астанкаў генерал-фельдмаршала, выкінутых у 1925 г. у парк былога маёнтка ў сяле Сахарава Ржэўскага павета Цвярской губерні, сталі мэтаю правядзення ўласнага журналісцкага расследавання ў гэтай стужцы.

Жанравую мадэль фільма-расследавання выкарыстаў таксама і прызнаны майстар дакументальнага экрана – рэжысёр М. Якжэн у відэафільме «...З забыцця і праху. Іаан Грыгаровіч» (2000). Метад расследавання рэжысёр выкарыстаў для таго, каб разабрацца, чаму было сцёрта з гістарычнай памяці народа імя гэтага дзеяча – пачынальніка беларускай археаграфіі, а яго пахаванне на Волкаўскіх могілках г. Санкт-Пецярбурга страчана.

М. Якжэн у сваіх экранных партрэтах не толькі выкарыстоўвае метад расследавання. Калі дазваляе матэрыял, ён імкнецца перадаць сродкамі кіно багаты ўнутраны паэтычны свет сваіх герояў: пісьменнікаў Э. Ажэшкі («Душа мая з імем жаночым. Эліза Ажэшка», 2003), Я. Баршчэўскага («Летуценнік», 2005). Падобную жанравую мадыфікацыю традыцыйнага фільма-партрэта прафесар В. Нячай вызначае як *паэтычную біяграфію*, якая спалучае ў сваёй структуры драматычны і лірычны жанравыя пачаткі.

Узбагачэнне мастацкай выразнасці гістарычных фільмаў гэтага перыяду здзяйсняецца за кошт міжвідавога сінтэзу вобразных сродкаў ігравога, дакументальнага, анімацыйнага кіно. Так, ідэі спалучэння прыёмаў розных відаў кіно і камп'ютарнай графікі ўвасабляе рэжысёр Я. Сяцько ў сваіх відэафільмах пра славутага вучонага, першага рускага дыпламата ў Японіі В. Гашкевіча «Адысея Гашкевіча» (2005), пра выдатных палітычных, грамадскіх і культурных дзеячаў XIX ст. Т. Касцюшку, А. Міцкевіча, І. Дамейку, Н. Орду «Нарадзіўся я літвінам» (2006). Гэткі сінтэз робіць яго кінатворы відовішчнымі, візуальна захапляльнымі.

У падраздзеле 3.2 **«Дакументальна-мастацкія фільмы-«хронікі» 1990–2006 гг.»** аналізуюцца кінастужкі В. Шавялевіча, якія напрыканцы XX ст. прадэманстравалі магчымасці абнаўлення формы гістарычнага фільма за кошт унутрывідавога (дакументальнае і ігравое кіно) і міжвідавога (кіно і тэлебачанне) сінтэзу.



Репозиторий БГУКИ

У сукупнасці дакументальна-мастацкія фільмы-«хронікі» В. Шавялевіча прадстаўляюць гісторыю беларускай дзяржавы з X па XVII стст. Агульнастылявое адзінства фільмаў было забяспечана аб'яднаннем гісторыка-археаграфічнага падыходу (прапанаванага пастаянным пачынаючы з фільма «Да вас, сучаснікі мае» сасцэнарыстам Сяргеем Тарасавым – вядомым беларускім медыевістам) і паэтыка-метафарычнай танальнасці (якая ідзе ад рэжысёра). Асвятляючы гістарычнае мінулае нашай краіны, аўтар абапіраецца на вехі жыцця асветнікаў і вядомых дзяржаўных дзеячаў – так званых «пасіянарных» асоб (паняцце, прапанаванае Л. Гумілёвым), якія вызначалі гістарычны шлях беларускага народа.

Тэлевізійныя фільмы рэжысёра «Прыйдзі і віждзь» (1993), «Пастка для зубра» (1994–1995) можна ўмоўна аб'яднаць у дылогію, якая храналагічна ахоплівае перыяд з канца XIV да пачатку XV ст. і адлюстроўвае гістарычныя падзеі, звязаныя з дынастычнай барацьбой за ўладу ў Вялікім Княстве Літоўскім. Так, у тэлефільме «Прыйдзі і віждзь» В. Шавялевіч метафарычна выказаў сваё стаўленне да палітыкі і ўлады, паказаўшы, наколькі чалавек можа быць лісліваым, хітрым і каварным у дасягненні сваёй мэты. У цэнтры кінастужкі – канфлікт паміж кроўнымі братамі Андрэем Полацкім (акцёр Ф. Варанецкі) і Ягайлам (акцёр М. Кірычэнка).

Суб'ектыўны роздум над праблемамі гісторыі, улады і маралі В. Шавялевіч працягнуў у фільме «Пастка для зубра», які складаецца з дзвюх частак – «Ягайла» (1994), «Вітаўт» (1995). Паэтыка тэлестужкі вызначаецца шматслойнай структурай канфліктаў: знешняга (антаганістычнага), які выяўляецца ў процістаянні Ягайлы і Вітаўта крыжацкаму ордэну, і ўнутранага (псіхалагічнага) – князя-ўладара (Ягайла) і чалавека. Двухузроўневая мадэль канфлікту абумовіла сінтэз жанравых канонаў дварцовай хронікі і псіхалагічнай драмы.

Здымачная група працавала на руінах палацавага комплексу Сапегаў у Ружанах, у сутарэннях якога была пабудавана своеасаблівая мадэль шэкспіраўскага тэатра «Глобус». На «падмостках» «Глобуса», як на адкрытай авансцэне гісторыі, быў разыграны нібыта драматычны спектакль пра адвечныя маральныя праблемы ўлады. Ружанскі палац для рэжысёра стаў пластычным увасабленнем тагачаснай Беларусі – пабітай і патаптанай.

У дылогіі «Беларусь на крыжы вякоў» (2000, 2002) В. Шавялевіч прадставіў аўтарскую канцэпцыю айчыннай гісторыі ад старажытнасці да XVII ст. у кантэксце спасціжэння маральнага вопыту народа (жыццё «пад крыжам» і «на крыжы»). Рэжысёр мантажна паяднаў розныя гістарычныя эпохі ў мастацкім часе фільма, вобразна асэнсаваў дыялектычную складанасць гісторыі з гуманістычных маральна-этычных пазіцый, абапіраючыся на каштоўнасныя арыентацыі хрысціянства.

Для экраннага аповеду В. Шавялевіч абраў гісторыі тых дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, якія, на яго думку, сталі адметнымі асобамі свайго часу, зрабілі вялікі ўклад у развіццё духоўнай спадчыны беларусаў. Прынцыпам стварэння вобразаў



кожнага асобнага гістарычнага персанажа стала вылучэнне з іх жыцця важнага ўчынку ці падзеі. Так, стварэнне Крыжа Л. Богшай па замове Еўфрасінні Полацкай набыло вялікі сэнс у гісторыі: Крыж стаў беларускай святыняй. Прыняцце Міндоўгам запрашэння на княжанне ў Наваградскае княства з Літвы стала лёсавызначальным для гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Неабходнасць па-мастацку выразна прадставіць гістарычны час абумовіла зварот В. Шавялевіча да фальклору – скарбонкі этнічнай і родавай памяці народа. Аўтары не змаглі адмовіцца ад выкарыстання багатай вусна-паэтычнай спадчыны ў расповедзе аб некаторых гістарычных дзеячах. Так, у фільме было інсцэніравана гістарычнае паданне пра тое, як вяшчун Ліздзейка растлумачыў сон Гедыміна, з якога вынікала неабходнасць заснавання і будаўніцтва Вільні.

Сюжэтныя перыпетыі ў дылогіі «Беларусь на крыжы вякоў» разгортваліся ў рэальных «дэкарацыях» архітэктурных ансамбляў Вільнюса, Крэва, Ружан, Міра, што дазволіла В. Шавялевічу стварыць арыгінальны гістарычны фільм, у якім арганічна суадносяцца факталагічная дакладнасць і аўтарскае самавыяўленне.

Такім чынам, у сваіх дакументальна-мастацкіх фільмах-«хроніках» В. Шавялевіч прадставіў аўдыёвізуальны эквівалент беларускай «гісторыі ў тварах». Стужкі рэжысёра («Да вас, сучаснікі мае», «Прыйдзі і віждзь», «Пастка для зубра», «Беларусь на крыжы вякоў») заснаваны на спалучэнні прыёмаў дакументальнага і ігравога кіно. Найкаштоўнейшымі сродкамі аб'ектывацыі і актуалізацыі гістарычнага часу ў іх сталі архіўныя дакументы, помнікі матэрыяльнай культуры. Сучаснае ўспрыманне гісторыі ў фільмах В. Шавялевіча падаецца праз суб'ектыўную праекцыю камуніканта, які выступае ў якасці «рэтранслятара часу» (навукоўцы, рэлігійнага дзеяча). Рэальны топас гісторыі забяспечвае стварэнне своеасаблівага «калідора часу», дазваляе спалучыць гістарычнае мінулае і сучаснасць.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

Гістарычнае кіно выяўляе адметнасць гістарычнага шляху народа, значнасць дзейнасці яго выдатных прадстаўнікоў розных часоў, робячы актыўнае маральнае, эмацыянальнае, эстэтычнае ўздзеянне на глядацкую аўдыторыю.

1. Гістарычны фільм з'яўляецца найстарэйшым тэматычна-жанравым феноменам кінамастацтва, скіраваным на *вобразнае асэнсаванне* і *экраннае ўвасабленне* гістарычнага працэсу. Вызначальнымі прыкметамі гістарычнага фільма з'яўляюцца *«гістарычная падзея»* (факт, з'ява мінулага, уключаная ў фабулу кінастужкі), *«гістарычны персанаж»* (герой фільма, які можа мець прататып у гісторыі ці ўвасабляць рысы чалавека пэўнай эпохі), *«гістарычны час»* (хада і



Репозиторий БГУКИ

ўзаемасувязь падзей), *«гістарычная прастора»* (тапаграфія падзей фільма). Выяўленне іх спецыфічнага пераўтварэння ў розных жанрах ігравога і дакументальнага гістарычнага фільма мае прынцыповае значэнне для мастацтвазнаўчага аналізу кінатвора. Так, у «чыстых» жанрах прыярытэт аддаецца індывідуалізаванаму гістарычнаму персанажу, вобразу якога падпарадкавана гістарычная падзея. Эстэтычны патэнцыял гістарычнага часу і гістарычнай прасторы адпаведна абмежаваны, бо яны функцыянуюць толькі ў якасці фону для дзеяння [1–3; 5; 6].

2. Эвалюцыя беларускага гістарычнага фільма адбывалася ў два этапы, якія вызначаюцца ў адпаведнасці са змяненнямі агульнай сацыякультурнай сітуацыі ў краіне.

Першы этап эвалюцыі (1925–1980-я гг.) характарызуецца ўвасабленнем канонаў «чыстых жанраў» (меладрамы, героіка-прыгодніцкага фільма) у ігравых стужках. Беларускі дакументальны гістарычны фільм у гэты час стылістычна не развіваўся. Да канца 1980-х гг. у дакументальным кіно зварот кінематаграфістаў да матэрыялу мінуўшчыны быў рэдкім і спарадычным.

Другі этап развіцця (1990–2006 гг.) характарызуецца рознанакіраванымі працэсамі міжжанравага сінтэзу (у ігравым кіно), дыверсіфікацыі традыцыйных жанраў і міжвідавога сінтэзу (у дакументальным кіно). У параўнанні з папярэднім этапам у кінастужках мяжы ХХ–ХХІ стст. пашыраецца храналагічны ахоп гістарычных падзей. Неад'емнай характарыстыкай сучасных гістарычных фільмаў стала аднаўленне гістарычных падзей у іх рэальным топасе, што забяспечвае стварэнне своеасаблівага калідора часу, праз які ажыццяўляецца сувязь мінулага і сучаснасці. Натуральная гістарычная прастора дазваляе стварыць больш рэалістычны вобраз гістарычнага персанажа. Выкарыстанне адпаведнага рэквізіту і рарытэтаў (зброя, вопратка), гістарычная рэканструкцыя інтэр'ераў, стылізацыя касцюма сталі абавязковымі ўласцівасцямі гістарычнага фільма [1; 3; 4; 9; 14].

3. Беларускі ігравы гістарычны фільм першага этапу (1925–1980-я гг.) прадстаўлены кінастужкамі ў «чыстых жанрах»: авантурна-прыгодніцкі фільм («Кастусь Каліноўскі» У. Гардзіна, «Я, Францыск Скарына» Б. Сцяпанава), меладрама («Магіла льва» В. Рубінчыка). Выключэнне складае фільм «Паручнік Кіжэ» А. Файнцымера, зняты ў рэдкім жанры трагіфарса. Вобразы гістарычных персанажаў у фільмах першага этапу былі пазбаўлены глыбіні, аўтары трактавалі іх аднабакова, надзялялі рысамі тыповых герояў-авантурыстаў і / ці герояў-каханкаў. У параўнанні з фільмамі 1920–1930-х гг., стваральнікі якіх (У. Гардзін, А. Файнцымер) не надавалі значэння мастацкаму асэнсаванню гістарычнага часу і гістарычнай прасторы, у кінастужках канца 1960-х – пачатку 1970-х гг. (рэжысёры Б. Сцяпанаў, В. Рубінчык) звярталася больш увагі на мастацкую рэпрэзентацыю гістарычнага хранатопу.

У беларускіх ігравых гістарычных фільмах другога этапу (1990–2006) прасочваецца тэндэнцыя да міжжанравага сінтэзу кодаў меладрамы, героіка-



прыгодніцкага фільма і псіхалагічнай драмы («Раман імператара (дварцовая хроніка»), «Крыж міласэрнасці» – абодва Д. Ніжнікоўскай, «Пракляты ўтульны дом» У. Арлова), эпапеі («Настасся Слуцкая» Ю. Ялхова) [1; 4; 13; 14].

4. У дакументалістыцы 1990–2006 гг. галоўным жанрам застаецца фільм-партрэт. Ён прадстаўлены як у традыцыйнай форме стужкамі рэжысёраў С. Гайдука, М. Князева, Я. Сяцько, так і жанрава-стылявымі мадыфікацыямі: фільм-расследаванне А. Алая, М. Якжэна, фільм-павучэнне В. Шавялевіча, В. Чацверыкова, «паэтычная біяграфія» М. Якжэна.

Выкарыстанне вобразных сродкаў дакументальнага і ігравога кіно, а таксама тэлебачання, абумовіла аўдыявізуальную своеасаблівасць дакументальна-мастацкіх фільмаў-«хронік» В. Шавялевіча («Да вас, сучаснікі мае», «Прыйдзі і віждзь», «Пастка для зубра», «Беларусь на крыжы вякоў»). Рэжысёр здолеў не толькі аднавіць падзеі далёкай мінуўшчыны, але «разамкнуць» у сучаснасць гістарычныя час і прастору. Для гэтага ён увёў адмысловы вобраз – героя-сучасніка, што ажыццяўляе дыялог з тэлегледачам, ствараючы адзінае быційнае вымярэнне, у якім суіснуюць персанажы аддаленых эпох і сённяшняга дня [2; 3; 5; 7; 8; 10–12; 14; 15].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання ўкаранёны ў вучэбны працэс ва ўстановах адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (4 акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 12 студзеня 2008 г., 4 лютага 2009 г., 10 лютага 2009 г., 31 мая 2010 г.) і «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» (1 акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 25 чэрвеня 2010 г.). Матэрыялы і вынікі дысертацыі выкарыстоўваюцца ў навукова-даследчыцкай дзейнасці дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», аб чым сведчыць акт аб укараненні ад 3 студзеня 2011 г.

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры далейшым даследаванні беларускага гістарычнага фільма, яго жанраў і рэжысёрска-стылявых вырашэнняў у ігравым і дакументальным кіно, вывучэнні тыпалагічных сувязей беларускага і расійскага кіно, пры падрыхтоўцы спецкурсаў па тэорыі і гісторыі кінамастацтва, пры выкладанні гісторыі мастацкай культуры Беларусі ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах краіны, улічваюча ў рэжысёрскай і сцэнарнай практыцы.

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання будуць садзейнічаць надалей больш глыбокаму мастацтвазнаўчаму асэнсаванню гістарычнага фільма з мэтай напісання курсавых, дыпломных работ, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і падручнікаў для сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь, пры падрыхтоўцы даследаванняў на саісканне акадэмічнай ступені магістра і вучонай ступені кандыдата навук.



Репозиторий БГУКИ

Практычная значнасць даследавання заключаецца ў тым, што яно можа стаць канцэптуальным фундаментам для разнастайных праектаў, арыентаваных на выхаванне патрыятызму ў моладзі, на паглыбленне сучаснага культурна-асветніцкага працэсу, на пашырэнне ведаў аб гістарычнай і мастацкай спадчыне Беларусі, на развіццё ў рэспубліцы гісторыка-экалагічнага турызму.

Улічваючы крызіснае становішча беларускага ігравога кіно, недахоп якаснага драматургічнага матэрыялу, можа быць мэтазгодным зварот да экранізацыі актуалізаваных у дысертацыі літаратурных сцэнарыяў «З-пад ярма» (Я. Дыла, І. Марон) і «Адам Міцкевіч» (М. Бераснеў).





## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК

1. Шаройка, А.М. Гісторыя ў жанры меладрамы / А.М. Шаройка // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2006. – № 4. – С. 85–93.
2. Шаройка, А.М. Да праблемы гістарычнага часу і прасторы ў беларускім гістарычным фільме / А.М. Шаройка // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2007. – № 8. – С. 52–59.
3. Шаройка, А.М. Беларуская гісторыя ў фільмах Віктара Шавялевіча / А.М. Шаройка // Маст. адукацыя і культура. – 2008. – № 3. – С. 52–56.

### Артыкулы ў навуковых зборніках, рэкамендаваных ВАК

4. Шаройко, Е.Н. Язэп Дыло: первое сценарное обращение к исторической тематике (по архивным материалам) / Е.Н. Шаройко // Белорусское кино в лицах : сб. ст. о кино / Белорус. гос. ин-т проблем культуры ; науч. ред. : О. Нечай, В. Скороходов. – Минск, 2004. – С. 78–82.
5. Шаройка, А.М. Вобразы гістарычнага часу ў тэлецыкле В. Шавялевіча «Беларусь на крыжы вякоў» / А.М. Шаройка // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : у 2 ч. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклору ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2007. – Ч. 2 : Праблемы тэатральнага, музычнага і кінатэлемастацтва ў кантэксце славянскіх культур у сучасным свеце. – С. 203–208.
6. Шаройка, А.М. Навуковае вывучэнне гістарычнай праблематыкі ў беларускай фалькларыстыцы, літаратуразнаўстве і мастацтвазнаўстве / А.М. Шаройка // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2007. – Вып. 2. – С. 298–301.
7. Шаройка, А.М. Культурныя (этнічныя) кантакты беларусаў з польскай і рускай культурай (на матэрыяле фільмаў М. Якжэна) / А.М. Шаройка // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : у 5 вып. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2008. – Вып. 5. – С. 298–301.
8. Шаройка, А.М. Экранныя партрэты гістарычных дзеячаў (этнакультурныя ўзаемадзеянні ўраджэнцаў Беларусі з народамі міру) / А.М. Шаройка // Экологическая антропология : ежегодник / Белорус. ком. «Дзеці Чарнобыля» ; гл. ред. Л.И. Тегако. – Минск, 2008. – С. 297–299.

### Матэрыялы канферэнцый

9. Шаройка, А.М. Пераемнасць гістарычных традыцый у развіцці кінамастацтва Беларусі / А.М. Шаройка // ІІ Няфёдаўскія чытанні «З подзвігам у сэрцы: тэма



Репозиторий БГУКИ

Вялікай Айчыннай вайны ў беларускім мастацтве XX – пачатку XXI стагоддзя» : зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-творч. канф., Мінск, 24–25 сак. 2005 г. / Беларус. дзярж. акад. мастацтваў. – Мінск, 2005. – С. 91–94.
10. Шаройка, А.М. Экранныя вобразы Напалеона Орды і яго сучаснікаў у гісторыка-культуралагічным кантэксце эпохі / А.М. Шаройка // Наполеон Орда: жизнь, творчество, художественное наследие : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. 200-летию Наполеона Орды, Минск, 15–16 февр. 2007 г. / Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора НАН Беларуси ; гл. ред. А.И. Локотко. – Минск, 2007. – С. 95–99.
11. Шаройко, Е.Н Образы истории в контексте современного белорусского кино / Е.Н. Шаройко // Культура. Наука. Творчество = Культура. Навука. Творчасць = Culture. Science. Arts : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 19–20 апр. 2007 г. / Белорус. гос. акад. искусств ; ред. совет: С.П. Винокурова (председатель) [и др.]. – Минск, 2008. – С. 268–269.
12. Шаройко, Е.Н. Жанровые модификации фильма-портрета в контексте православной тематики / Е.Н. Шаройко // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. тр. / ГрГУ им. Я. Купалы ; редкол. : М.А. Можейко (отв. ред.) [и др.]. – Гродно, 2010. – С. 245–248.

### Спіс дэпанаваных работ

13. Шаройка, А.М. Вопыт стварэння серыяла на гістарычную тэму / А.М. Шаройка // Нацыянальная спадчына і сучасныя праблемы культуры (прысвечана 60-годдзю вызвалення Беларусі) : тэз. дакл. XXIX навук. канф., Мінск, 22–23 крас. 2004 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2004. – С. 332–337. – Дэп. у ДУ «БелІСА» 30.06.2004. – № Д 200469.
14. Шаройка, А.М. Гістарычная тэма ў беларускім кінамастацтве на памежжы XX–XXI стст. / А.М. Шаройка // Культура Беларусі ў сусветнай культурнай прасторы: традыцыйныя каштоўнасці і праблемы сучаснасці : дакл. XXXI навук. канф., Мінск, 20–21 крас. 2006 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2006. – С. 186–190. – Дэп. у ДУ «БелІСА» 04.01.2007. – № Д 20072.
15. Шаройка, А.М. Вобразы дзеячаў беларускай гісторыі ў кіно / А.М. Шаройка // Каштоўнасці нацыянальнай культуры: грамадзянска-патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі (прысвечана 60-годдзю вызвалення Беларусі) : даклады, прачыт. на XXX канф. студэнтаў і аспірантаў БДУ культуры і мастацтваў, 20–21 крас. 2005 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал. : М.А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 313–316. – Дэп. у ДУ «БелІСА» 04.01.2007. – № Д 20073.



## РЭЗЮМЭ

**Шаройка Алена Мікалаеўна**

**Жанрава-стылявая эвалюцыя беларускага гістарычнага фільма**

**Ключавыя словы:** беларускі гістарычны фільм, гістарычная падзея, гістарычны персанаж, гістарычны час, гістарычная прастора, жанрава-стылявая эвалюцыя, жанравыя каноны, жанравыя разнавіднасці, індывідуальны аўтарскі стыль, фільм-партрэт.

**Мэта** даследавання – раскрыццё дынамікі і характару жанрава-стылявой эвалюцыі беларускага гістарычнага фільма.

Метадалагічная база даследавання грунтуецца на ўніверсальным прынцыпе гістарызму. Навуковая работа здзяйснялася на падставе сістэмнага і комплекснага падыходаў. Базавымі метадамі для даследавання кінематаграфічнага матэрыялу сталі кампаратыўны, гісторыка-параўнальны, мастацтвазнаўчы аналіз.

**Навуковыя вынікі і іх навізна.** Упершыню ў айчынным мастацтвазнаўстве распрацаваны метадычны падыход да аналізу гістарычнага фільма праз вызначэнне яго атрыбутыўных прыкмет. Вылучаны жанрава-стылявыя разнавіднасці беларускага гістарычнага фільма ў іграваным і дакументальным відах кінамастацтва. Выяўлены этапы эвалюцыі гістарычнага фільма ў айчынным кінематографе, а таксама прасочаны развіццё і ўзбагачэнне яго жанрава-стылявых структур – ад простых мастацкіх пабудоў да складаных жанравых мадыфікацый, заснаваных на сінтэзе традыцыйных магчымасцей кінамастацтва з эстэтыкай тэлебачання, відэакультуры, дыгітальнага мастацтва.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры далейшым даследаванні беларускага гістарычнага фільма, яго жанраў і рэжысёрска-стылявых вырашэнняў у іграваным і дакументальным кіно, вывучэнні тыпалагічных сувязей беларускага і расійскага кіно, пры падрыхтоўцы спецкурсаў па тэорыі і гісторыі кінамастацтва, пры выкладанні гісторыі мастацкай культуры Беларусі, улічваецца ў рэжысёрскай і сцэнарнай кінематаграфічнай практыцы.

Матэрыялы і вынікі даследавання могуць стаць канцэптуальным фундаментам для разнастайных праектаў, арыентаваных на выхаванне патрыятызму ў моладзі, на пашырэнне ведаў аб гістарычнай і мастацкай спадчыне Беларусі, на развіццё ў рэспубліцы гісторыка-экалагічнага турызму.

**Галіна выкарыстання**: мастацтвазнаўства, культуралогія (мастацкая культура).



Репозиторий БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

**Шаройко Елена Николаевна**

**Жанрово-стилевая эволюция белорусского исторического фильма**

**Ключевые слова:** белорусский исторический фильм, историческое событие, исторический персонаж, историческое время, историческое пространство, жанрово-стилевая эволюция, жанровые каноны, жанровые разновидности, индивидуальный авторский стиль, фильм-портрет.

**Цель** диссертационного исследования – раскрытие динамики и характера жанрово-стилевой эволюции белорусского исторического фильма.

Методологическая база исследования базируется на универсальном принципе историзма. Научная работа осуществлялась на основе системного и комплексного подходов. Базовыми методами для исследования кинематографического материала стали компаративный, историко-сравнительный, искусствоведческий анализ.

**Научные результаты и их новизна.** Впервые в отечественном искусствоведении разработан методологический подход к анализу исторического фильма через определение его атрибутивных признаков. Определены жанрово-стилевые разновидности белорусского исторического фильма в игровом и документальном видах киноискусства. Выявлены этапы эволюции исторического фильма в отечественном кинематографе, а также прослежены развитие и обогащение его жанрово-стилевых структур – от простых художественных построений до сложных жанровых модификаций, основанных на синтезе традиционных возможностей киноискусства с эстетикой телевидения, видеокультуры, дигитального искусства.

**Рекомендации по использованию.** Основные положения и результаты диссертации могут быть использованы при дальнейшем исследовании белорусского исторического фильма, его жанров и режиссерско-стилевых решений в игровом и документальном кино, при изучении типологических связей белорусского и российского кино, при подготовке спецкурсов по теории и истории кино, учитываться в режиссерской и сценарной кинематографической практике.

Материалы и результаты исследования могут стать концептуальным фундаментом для разнообразных проектов, ориентированных на воспитание патриотизма у молодежи, на расширение знаний об историческом и художественном наследии Беларуси, на развитие в республике историко-экологического туризма.

**Область использования:** искусствоведение, культурология (художественная культура).





## THE RESUME

**Sharoyko Elena Nikolaevna**

**Genre and Style Evolution of the Belarussian Historical Film**

**Key Words:** Belarussian historical film, historical event, historical character, historical time, historical space, genre and style evolution of the Belarussian historical film, genre canons, genre versions, individual author's style, film-portrait.

**The Aim of the Work** is to reveal the dynamics and nature of the genre and stylistic evolution of the Belarusian historical movie.

**The Methods of the Research.** The methodological base of research is based on a universal principle of a historicism. This scientific work was carried out on the basis of system and complex approaches. The base methods for analytics of a movie material are comparative, comparative typological, art criticism analysis.

**Scientific results and novelty.** For the first time a methodological approach to the analysis of historical film is developed which is performed through definition of its attributive signs and genre and style versions in fiction, and non-fiction types of motion picture arts. The stages of historical film evolution in native cinematography are singled out; the development and enriching of its genre and style structures from simple art constructions to complex genre modifications based on the synthesis of traditional cinema possibilities with the aesthetics of TV, videoculture and Digital Art are traced.

**Recommendations for usage.** The materials can be used in lecture and practical courses in higher educational establishments of the Republic of Belarus. The results and conclusions of the work can be used in research, scientific, methodological and pedagogical activities.

**Use area:** art criticism, culturology (art culture).




Репозиторий БГУКИ

Навуковае выданне

**Шаройка Алена Мікалаеўна**

**Жанрава-стылявая эвалюцыя беларускага гістарычнага фільма**

**Аўтарэферат**
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства
па спецыяльнасці 17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтваў

Рэпазіторый БГУКІ

Падпісана ў друк 25.02.2011 г. Фармат 60x84 1/16.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 1,48.
Тыраж 60 экз. Заказ № 48.
УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

Надрукавана на рызографе
УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"